# *§ 55–0. Рэспубліка Беларусь у першай палове 1990-х гг.

ДЗЯРЖАЎНЫ СУВЕРЭНІТЭТ
ГРАМАДЗЯНСТВА
БЕЛАВЕЖСКІЯ ПАГАДНЕННІ
УНІТАРНАЯ ДЗЯРЖАВА
ПРАВАВАЯ ДЗЯРЖАВА
САЦЫЯЛЬНАЯ ДЗЯРЖАВА
ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ДЗЯРЖАВА

«Парад суверэнітэтаў»




Назавіце і пакажыце на карце 15 рэспублік, што ўваходзілі ў склад СССР.

**Дзяржаўны суверэнітэт** — незалежнасць і самастойнасць дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае замежнага ўмяшання.

**1. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту.** Канфлікт М. С. Гарбачова і Б. М. Ельцына, абумоўлены прынцыповымі адрозненнямі іх поглядаў на будучыню СССР і Расіі, а таксама непрадуманае рэфармаванне савецкай сістэмы прывялі да чарады падзей, якую ў гісторыі называюць *«парадам суверэнітэтаў»*. Гэтая падзея ператварылася ў інструмент барацьбы за ўладу, каб аслабіць агульнасаюзны цэнтр, які ўзначальваў М. С. Гарбачоў, на карысць эліт у рэспубліках, што жадалі незалежнасці, інтарэсы якіх увасабляў Б. М. Ельцын. У 1988–1991 гг. рэспублікі СССР прынялі дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Першымі пра яго аб'явілі Эстонія, Латвія і Літва. 12 чэрвеня 1990 г. была прынятая Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР. Дэкларацыя «Аб **дзяржаўным суверэнітэце** Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» была прынятая Вярхоўным Саветам БССР **27 ліпеня 1990 г.**

Дэкларацыя вызначыла суадносіны ўладных паўнамоцтваў Савецкага Саюза і рэспублікі — на тэрыторыі БССР усталёўвалася вяршэнства Канстытуцыі і законаў рэспублікі. Падкрэслівалася, што ўсе грамадзяне і асобы без грамадзянства, дзяржаўныя

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»**

**Арт. 1**

БССР — суверэнная дзяржава, якая зацвердзілася на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу.

Неад'емныя правы БССР як суверэннай дзяржавы рэалізуюцца ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права. БССР ахоўвае і абараняе нацыянальную дзяржаўнасць беларускага народа…

**Арт. 5**

Зямля, яе нетры, іншыя прыродныя рэсурсы на тэрыторыі БССР, паветраная прастора з'яўляюцца ўласнасцю беларускага народа, якому належаць выключныя правы па іх валоданні, карыстанні і распараджэнні…

БССР утварае Нацыянальны банк, падпарадкаваны Вярхоўнаму Савету рэспублікі, стварае сваю фінансава-крэдытную сістэму; пацвярджае правы ўласнасці на спецыялізаваныя банкі, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі на момант прыняцця гэтай Дэкларацыі, арганізуе ўласныя падатковую і мытную службы, мае права на стварэнне ўласнай грашовай сістэмы.

*1. Якія прынцыпы дзяржаўнага суверэнітэту былі абвешчаны ў Дэкларацыі?*

*2. Як у ёй была вызначана эканамічная аснова дзяржаўнага суверэнітэту БССР?*

органы, прадпрыемствы, установы, арганізацыі, якія знаходзяцца і дзейнічаюць на тэрыторыі БССР, абавязаныя выконваць яе заканадаўства.

Вярхоўны Савет БССР вызначыў Днём Незалежнасці Беларусі дату прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Аднак большасць жыхароў Беларусі не сталі ўспрымаць гэтую дату як пачатак адліку суверэннай дзяржаўнасці, бо яна была звязаная з разбурэннем савецкай дзяржавы. На рэспубліканскім рэферэндуме 1996 г. з прапановы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларусы выказаліся за перанос святкавання Дня Незалежнасці на 3 ліпеня — дату вызвалення г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.




*Урачысты сход у гонар Дня Незалежнасці. 2024 г.*

Чаму менавіта 3 ліпеня зрабілася для беларускага народа сімвалам незалежнасці?

За гэта прагаласавалі 88,18 % грамадзян з ліку тых, хто ўдзельнічаў у рэферэндуме.

Як вы лічыце, пра што сведчылі высокая яўка жыхароў БССР і вынікі іх галасавання на Усесаюзным рэферэндуме 1991 г.?

Намагаючыся спыніць «парад суверэнітэтаў», кіраўніцтва СССР ініцыявала правядзенне 17 сакавіка 1991 г. Усесаюзнага рэферэндуму па пытанні захавання Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік як абноўленай федэрацыі раўнапраўных суверэнных рэспублік. Улады Грузіі, Літвы, Малдовы, Латвіі, Эстоніі і Арменіі адмовіліся праводзіць галасаванне. У БССР на ўчасткі для галасавання прыйшло 83,3 % грамадзян, якія мелі права голасу. 82,7 % з іх падтрымалі захаванне СССР.

Насуперак меркаванню народаў, працэс распаду СССР працягваўся. Для большасці беларусаў развал агульнай дзяржавы (СССР) быў нечаканасцю і ўспрымаўся вельмі балюча.

### Афармленне статусу незалежнай суверэннай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь

Пасля правалу спробы захаваць СССР Вярхоўны Савет БССР **25 жніўня 1991 г.** прыняў Закон «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі „Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі“».

**19 верасня 1991 г.** Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне змяніць назву «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка» на «Рэспубліку Беларусь», а таксама зацвердзіў, без сур'ёзных навуковых дыскусій і правядзення рэферэндуму, новыя дзяржаўныя сімвалы (сцяг і герб). 18 кастрычніка 1991 г. быў прыняты Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь».

Прыняццем вышэйназваных законаў Рэспубліка Беларусь юрыдычна аформіла свой статус як незалежная суверэнная дзяржава.

### Падпісанне Белавежскага пагаднення

**8 снежня 1991 г.** прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын, прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук, старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч падпісалі «Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў», вядомае як *«Белавежскае пагадненне»*. У яго прэамбуле запісана: «Саюз

ССР як суб’ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыняе сваё існаванне». Такім чынам, насуперак вынікам Усесаюзнага рэферэндуму 1991 г. была дэнансаваная Дамова аб стварэнні СССР.

12 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь XII склікання на сваім сходзе ратыфікаваў Белавежскае пагадненне, стварэнне СНД і распад СССР.

Вынікі галасавання былі такія: 263 — «за», 2 — «устрымаліся» і ўсяго 1 — «супраць». У Авальнай зале быў адзіны дэпутат, які пры галасаванні кіраваўся вынікамі сакавіцкага рэферэндуму 1991 г., — Аляксандр Лукашэнка. Ён сваім голасам выказаў меркаванне большасці беларусаў, якія падтрымалі на рэферэндуме 1991 г. захаванне Савецкага Саюза.

**2. Грамадска-палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс.** З распадам СССР была разбурана і агульная сістэма кіравання гаспадаркай. Эканоміка БССР была ў вялікай ступені інтэграваная з іншымі часткамі народнагаспадарчага комплексу СССР. Разрыў эканамічных сувязей, імклівы рост цэн на энерганосьбіты і сыравіну, якая імпартавалася, выступілі прычынамі глыбокага эканамічнага крызісу, у якім апынулася рэспубліка напачатку 1990-х гг.

На момант атрымання незалежнасці БССР была лідарам сярод рэспублік СНД паводле паказчыка прыбытку на душу насельніцтва, мела развіты прамысловы сектар. Беларусь належала да самых індустрыялізаваных краін свету. Але ўжо ў 1991 г. пачалося падзенне ўзроўню вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, значна вырасла інфляцыя. У 1993–1994 гг. яе тэмпы ў Беларусі перавышалі 2000 %. Рэзка выраслі цэны на прамысловую прадукцыю, спажывецкія тавары, а рэальныя даходы насельніцтва знізіліся амаль у 2 разы. Праз вываз тавараў, цэны на якія ў БССР рэгуляваліся,



Што, на вашу думку, сімвалізуе ілюстрацыя?

Успомніце, чаму БССР называлі «зборачным цэхам» Савецкага Саюза.

### Эканамічны крызіс першай паловы 1990-х гг.




*Карткі на прадукты. 1993 г.*

Якую прыкмету эканамічнага крызісу паказвае ілюстрацыя?

у суседнія краіны павялічыўся дэфіцыт на спажывецкім рынку рэспублікі. Былі ўведзеныя талоны на тавары, карткі спажыўца.

Крызіс ахапіў прамысловасць, сельскую гаспадарку, фінансавую і сацыяльную сферы. Узмацнілася дыферэнцыяцыя даходаў насельніцтва. З'явілася беспрацоўе, якога ў рэспубліцы не было ўжо шмат дзесяцігоддзяў. Колькасць толькі зарэгістраваных беспрацоўных у 1994 г. складала больш за 100 тыс. чалавек. Пачалі зніжацца аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва і аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння. У 1991–1994 гг. сярэдняя працягласць жыцця ў рэспубліцы знізілася з 71,1 да 68,9 года.

**Палітычны крызіс першай паловы 1990-х гг.**

У момант абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР з'яўлялася *парламенцкай рэспублікай*. Выканаўчая ўлада належала Кабінету Міністраў, якім кіраваў В. Ф. Кебіч. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляў Вярхоўны Савет XII склікання пад старшынствам С. С. Шушкевіча. Рэспубліка Беларусь перажывала палітычны крызіс: абмеркаванне і прыняцце рашэнняў Вярхоўным Саветам зацягваліся, узмацнілася супрацьстаянне розных палітычных груповак. Пра палітычны крызіс сведчыў і той факт, што на працягу чатырох гадоў Вярхоўны Савет не мог прыняць Канстытуцыю. Насельніцтва Беларусі ўсё мацней выказвала незадаволенасць эканамічнай сітуацыяй у краіне.

Успомніце асноўныя прыкметы парламенцкай рэспублікі як формы праўлення.

Грамадска-палітычныя змены, якія адбыліся, глыбокі эканамічны крызіс ставілі перад урадам рэспублікі складаныя задачы і патрабавалі новых метадаў кіравання. Беларуская палітычная сістэма мела патрэбу ў моцным цэнтры, які б мог узяць на сябе адказнасць за лёс дзяржавы.

**3. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.** Пасля здабыцця краінай незалежнасці паўстала неабходнасць прыняцця ўласнага Асноў-

нага Закона — **Канстытуцыі**. У першыя гады дзяржаўнага суверэнітэту на тэрыторыі рэспублікі дзейнічала Канстытуцыя БССР 1978 г. з тымі дапаўненнямі, якія былі ўнесены Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце БССР і іншымі прававымі актамі, прынятымі ў перыяд незалежнасці.

**Канстытуцыя** — дакумент, які мае найвышэйшую юрыдычную сілу і вызначае будову дзяржавы, правы, свабоды і абавязкі грамадзян.

Для распрацоўкі праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у ліпені 1990 г. Вярхоўны Савет стварыў Канстытуцыйную камісію. Падрыхтоўка праекта праходзіла ў гарачай дыскусіі, але ў вузкім коле, без шырокага народнага абмеркавання. У выніку першы варыянт беларускай Канстытуцыі стаў вынікам барацьбы за ўладу паміж групамі дэпутатаў Вярхоўнага Савета.

Вострыя спрэчкі разгарнуліся наконт формы праўлення: якая мае быць рэспубліка — прэзідэнцкая ці парламенцкая? Частка дэпутатаў Вярхоўнага Савета не хацела выпускаць з рук кіраванне краінай і супрацiўлялася ўвядзенню пасады Прэзідэнта з шырокімі паўнамоцтвамі, які б абіраўся ўсімі грамадзянамі. У выніку быў прыняты кампрамісны варыянт: Прэзідэнт абіраўся ўсенародна, але яго ўлада паводле першай рэдакцыі Канстытуцыі была моцна абмежаваная паўнамоцтвамі Вярхоўнага Савета.

Успомніце, што такое рэспубліка.

**15 сакавіка 1994 г.** Вярхоўны Савет прыняў Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь. Гэты дзень з'яўляецца дзяржаўным святам — Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Рэспубліка Беларусь абвяшчалася *унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай*. Канстытуцыя ўвяла інстытут прэзідэнцтва.




15 сакавіка
Дзень Канстытуцыі
Рэспублікі Беларусь

Цягам свайго дзеяння Канстытуцыя ўдасканальвалася, у яе ўносіліся змяненні і дапаўненні. Кожны раз прапанаваныя змены абмяркоўваліся з беларускім народам. Важныя рашэнні наконт дапаўненняў і змен у Асноўны Закон краіны былі прынятыя на рэспубліканскіх рэферэндумах: 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г. і 27 лютага 2022 г.

У чым заключаецца значнасць гэтага свята для беларускага народа?

**4. Структура і функцыі органаў улады.** У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. быў замацаваны *прынцып падзелу ўлад*.

Заканадаўчая ўлада

Згодна з ім найвышэйшым прадстаўнічым (пастаянна дзеючым) і заканадаўчым органам дзяржаўнай улады з'яўляўся *Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь*, які абіраўся тэрмінам на 5 гадоў. Працы Вярхоўнага Савета ў першай палове 1990-х гг., прыняццю ім законаў перашкаджалі барацьба паміж фракцыямі і асабістыя амбіцыі часткі дэпутатаў.

Выканаўчая ўлада

Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляў *Кабінет Міністраў*. Яго члены прызначаліся *Прэзідэнтам* і ўзгадняліся з Вярхоўным Саветам.

Судовая ўлада

Судовая сістэма Рэспублікі Беларусь будавалася на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі і складалася з Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і судоў агульнай юрысдыкцыі, да якіх належалі Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, абласныя (Мінскі гарадскі) суды, эканамічныя суды абласцей і г. Мінска і раённыя (гарадскія) суды. Судаўладкаванне вызначалася Канстытуцыяй і законам. Стварэнне надзвычайных судоў забаранялася.

Мясцовыя органы ўлады

У рэгіёнах улада належала мясцовым Саветам дэпутатаў, якія ажыццяўлялі сваю дзейнасць у межах адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (вёскі, горада, раёна, вобласці) і абіраліся жыхарамі гэтых тэрытарыяльных адзінак. Саветы зацвярджалі праграмы эканамічнага і сацыяльнага развіцця горада (раёна, вобласці), распараджаліся даходамі і тратамі мясцовых бюджэтаў, камунальнай уласнасцю, усталёўвалі мясцовыя падаткі і зборы, вырашалі іншыя пытанні, звязаныя з развіццём сваёй тэрыторыі.

Структура мясцовых органаў улады ў Рэспубліцы Беларусь мянялася. З зацвярджэннем пасады Прэзідэнта ў 1994 г. *мясцовыя выканаўчыя камітэты*

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 г.**

**Арт. 6**

Дзяржава заснаваная на прынцыпе падзелу ўлад: заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя: яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго.

**Арт. 79**

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь з'яўляецца вышэйшым прадстаўнічым пастаянна дзеючым і адзіным заканадаўчым органам дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь.

**Арт. 95**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады.

**Арт. 106**

Для рэалізацыі паўнамоцтваў выканаўчай улады ў галінах эканомікі, знешняй палітыкі, абароны, нацыянальнай бяспекі, аховы грамадскага парадку і іншых сферах дзяржаўнага кіраўніцтва пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ствараецца Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

1. *Які прынцып рэалізацыі дзяржаўнай улады быў замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.? У чым ён заключаецца?*
2. *Якую ролю ў сістэме дзяржаўнай улады адыгрываў Вярхоўны Савет?*
3. *Якія функцыі выконваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь?*
4. *Для чаго ствараўся Кабінет Міністраў?*

перасталі быць органамі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Кіраўнікі выканкамаў (раённых, абласных) пачалі прызначацца Кіраўніком дзяржавы. У рэспубліцы сфарміравалася «прэзідэнцкая вертыкаль» — сістэма дзяржаўнага кіравання, у якой уся выканаўчая ўлада сканцэнтравана ў органах, падпарадкаваных Прэзідэнту, што забяспечвае моцную цэнтралізацыю ўлады і строгі кантроль за выкананнем рашэнняў на ўсіх узроўнях.

**Пачатак прэзідэнцкага праўлення**

**5. Прэзідэнцкія выбары 1994 г.** **10 ліпеня 1994 г.** Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў абраны **Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка**. Ад гэтага моманту



*20 ліпеня 1994 г. у Авальнай зале Дома ўрада адбылася інаўгурацыя першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі*

ў навейшай гісторыі Беларусі пачаўся этап прэзідэнцкага праўлення.

А. Р. Лукашэнка, нягледзячы на шматлікія эканамічныя цяжкасці ў краіне, не пагадзіўся на правядзенне рэформаў метадам так званай «шокавай тэрапіі», які прадугледжваў рэзкі перавод сацыяльнай сферы на рыначныя адносіны.

У Беларусі ў той перыяд існаваў мінімальны ўзровень сацыяльных гарантый у такіх сферах, як ахова здароўя, адукацыя, культура, жыллёва-камунальная гаспадарка. Дзяржава захоўвала кантроль за рознічнымі цэнамі на асноўныя спажывецкія тавары і паслугі для насельніцтва, у тым ліку на паліва, газ, электраэнергію.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У 1994 г. А. Р. Лукашэнка сфармуляваў сваю асноўную задачу як Прэзідэнта наступным чынам:

*«Адвесці дзяржаву і народ ад прорвы — вось першачарговая задача Прэзідэнта. Наперадзе вялікая і цяжкая работа, якую ніхто, апроч нас саміх, не зробіць. Я веру ў мудрасць і працавітасць беларускага народа. Перакананы, што рашэнне гэтай задачы нам па плячы».*

**Паводле матэрыялаў афіцыйнага сайта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2025 г.):**

…за 2010–2024 гг. ВУП краіны павялічыўся ў супастаўных цэнах на 25,2 % пры росце прадукцыйнасці працы за названы перыяд на 41,8 %.

Валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва паводле парытэту пакупніцкай здольнасці вырас з 15,3 тыс. долараў у 2010 г. да 33,0 тыс. долараў у 2024 г.

*Як вы лічыце, якія фактары сталі вырашальнымі ў выкананні пастаўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь першачарговай задачы развіцця беларускай дзяржавы? Сваю думку аргументуйце.*

*З абраннем першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пачынаецца этап развіцця сапраўднага суверэнітэту, заснаванага на строгай вертыкалі ўлады з выразна размежаванымі паўнамоцтвамі і прамым волевыяўленнем народа. Шлях да пабудовы такой мадэлі быў няпросты, але быў абумоўлены гістарычным выбарам беларускага народа ў 1994 г.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 12 чэрвеня 1990 г. — прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР | 27 ліпеня 1990 г. — прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. У чым праяўляўся палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс у Беларусі ў першай палове 1990-х гг.? Якія былі яго прычыны?
2. Складзіце тэзісны план (або храналагічную табліцу) «Этапы ўтварэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь».
3. Назавіце асноўныя прынцыпы, на якіх заснаваная Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.
4. У чым праяўляецца прынцып падзелу ўлад у Рэспубліцы Беларусь? Ахарактарызуйце структуру органаў улады ў краіне ў першай палове 1990-х гг. Як паўнамоцтвы асобных галін улады супольна забяспечваюць эфектыўнае развіццё нашай дзяржавы?